УДК 7.011.26:[39+7]"18"

# ДА ГІСТОРЫІ ПАНЯЦЦЯ «НАРОДНАЕ МАСТАЦТВА»

***В. А. Лабачэўская,***
*доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле даецца кароткі агляд гісторыі фарміравання і ўжывання паняцця «народнае мастацтва» ў этнаграфіі, мастацтвазнаўстве і практыцы народных промыслаў, пачынаючы з сярэдзіны XIX ст., у краінах Еўропы, Расіі; падыходаў да народнага мастацтва як асновы нацыянальнага стылю ў пачатку XX ст. у Беларусі; пераарыентацыі яго на народныя промыслы і афіцыйны кірунак пад кіраўніцтвам прафесійных мастакоў у савецкі час. Робіцца вывад аб неабходнасці пераасэнсавання навуковых традыцый, якія склаліся ў гэтай сферы грамадскай думкі, навукі і практыкі, на падставе сучаснай метадалогіі, абгрунтавання айчыннай класіфікацыі гістарычных форм народнага мастацтва і адпаведнай тэрміналогіі ў гэтай галіне мастацтвазнаўства.

**Ключавыя словы:** народнае мастацтва, мастацтвазнаўства, этнаграфія, народныя промыслы, мастацтвазнаўчая тэрміналогія, Беларусь.

# TO THE HISTORY OF THE CONCEPT OF «FOLK ART»

***V. Labacheuskaya,***
*Doctor of Art History, Associate Professor, Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Art»*

**Abstract.** The article gives a brief overview of the history of the formation and application of the concept of «folk art» in ethnography, art history and the practice of folk crafts, starting from the mid-19th century, in Europe and Russia; approaches to folk art as the basis of the national style of the early twentieth century in Belarus; its reorientation towards folk crafts and official management under the guidance of professional artists during the Soviet era. The author concludes that it is necessary to rethink the scientific traditions that have developed in this area of public opinion,

science and practice, on the basis of modern methodology, the justification of the national classification of historical forms of folk art and the corresponding terminology in this area of art history.
**Keywords:** folk art, art history, ethnography, folk crafts, art historical terminology, Belarus.

Паскораныя сацыяльныя, культурныя, тэхналагічныя працэсы ў наш час усё больш павялічваюць разрыў паміж тэорыяй, якую фарміруе гуманітарная навука як спосаб пазнання чалавека і рэчаіснасці, і практыкамі засваення і пераўтварэння чалавекам свету вакол сябе. Гэтая праблема актуальная і для сферы мастацкай творчасці, якую прынята называць «народным мастацтвам», у прыватнасці, для яго матэрыяльных, фігуратыўных відаў, якія вызначаюцца тэрмінам «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва».

Тэрмін «народнае мастацтва» і традыцыя яго ўжывання ў этнаграфіі, мастацтвазнаўстве і сацыяльнай практыцы былі запачаткаваны ў сярэдзіне XIX ст. Адным з першых яго ўжыў Юзаф Крашэўскі, які ў 1860 г. надрукаваў кнігу «Мастацта славян» («Die Kunst der Slaven»). Канструяванне змястоўнага напаўнення паняцця адбывалася ў рэчышчы ідэй эпохі рамантызму і развіцця нацыянальных форм стылю гістарызму, жывілася філантрапічнай ідэяй ратавання ручнога спосабу рамеснай вытворчасці і сялянскага мастацтва, якія адыходзілі ў мінулае пад націскам капіталістычнай машыннай індустрыі. Развіццё этнаграфіі як навукі, збіранне этнаграфічных прадметаў музеямі, стварэнне ў Еўропе мастацка-прамысловых музеяў (Вена, Лондан) актуалізавалі эстэтыку народных твораў, узнялі рэчы бытавыя да ўзроўню мастацтва. Народны касцюм, тканіны і іншыя народныя вырабы становяцца крыніцамі ведаў аб архаіцы, старажытнасці, якімі ў той час цікавіліся археалогія і фальклярыстыка, што знаходзіліся ў стане свайго навуковага станаўлення. Нацыянальныя ідэі і рухі, якія выспявалі ў асяроддзі інтэлігенцыі, уключалі народныя творы з выразнымі этнічнымі рысамі ў кантэкст агульнанацыянальнай культуры, будавалі на гэтай аснове нацыянальныя мастацкія стылі.

Нацыянальная знакавасць таго, што першапачаткова было сялянскім, пасадскім, местачковым, запатрабавала перафарміравання яе рэферэнта – матэрыяльнай формы – да патрэб іншага спажыўца – гараджаніна, арыентаванага на нацыянальную ідэю. У апошнюю трэць XIX ст. філантрапічная мэта дапамогі рамесніку і селяніну ўвасобілася ў арганізацыю навучання і ўдасканалення іх вырабаў, пры-

стасавання іх да густаў спажыўцоў з вонкавага гарадскога асяроддзя. Школы і майстэрні спачатку з'явіліся ў Швецыі, Швейцарыі, Аўстра-Венгрыі, Расійскай імперыі. Мадэль іх арганізацыі была прывіта прыватнымі і земскімі ініцыятывамі на тэрыторыі Беларусі (ткацкая майстэрня Ганны Моль і інш.). Навучанне майстроў было арыентавана на вытворчасць на падставе «паляпшэння» – прыстасавання да густаў і патрэб гарадскога інтэлігентнага спажыўца мастацкіх вырабаў, узоры якіх распрацоўвалі прафесійныя мастакі, заангажаваныя ў ідэю захавання народнага мастацтва. У выніку катэгорыі «народнае мастацтва» і «народныя промыслы» ў грамадскай свядомасці і практыцы, у паточнай і навуковай тэрміналогіі пачалі атаясамлівацца, набылі тоеснасць.

У пачатку XX ст. культурна-адраджэнцкая плынь інтэлектуальнай думкі і грамадскай практыкі нацыянальнага будаўніцтва ў Беларусі звярнулася да народнага мастацтва як асновы стварэння беларускага стылю. Гэтыя пытанні фармуляваў у сваёй нашаніўскай публіцыстыцы Вацлаў Ластоўскі. Адначасова назапашваліся веды аб беларускім народным мастацтве, адбываліся яго рэпрэзентацыі на выстаўках, як сельскагаспадарчых, так і спецыяльных, фарміраваліся музейныя зборы і прыватныя калекцыі. У 1920-я гг. з'явіліся першыя даследаванні. Навуковыя падыходы, якія фармуляваліся ў секцыях этнаграфіі і народнага мастацтва Інбелкульта ў агульным трэндзе краязнаўчага руху, увасабляліся ў камплектаванні музея пры Інбелкульце і Беларускага дзяржаўнага музея, дзе згодна з прынятай музейнай класіфікацыяй у этнаграфічным аддзеле прадметы народнага мастацтва суседнічалі з бытавымі рэчамі. Вацлаў Ластоўскі, Мікалай Шчакаціхін, Мікалай Касяровіч сфарміравалі таксама мастацтвазнаўчы падыход да народнага мастацтва. У 1920-я гг. выявіўся менавіта мастацтвазнаўчы кірунак у вывучэнні народнага мастацтва. Прафесійная мастацкая практыка развівалася пераважна ў рэчышчы этнаграфізму, бо Міхась Філіповіч, Анатоль Тычына і іншыя мастакі імкнуліся ўвасобіць у сваіх творах беларускія адметнасці і стварыць беларускі нацыянальны стыль.

Савецкая ўлада абрала прагматычны падыход да народных рамёстваў і промыслаў. Дзяржаўная палітыка ў СССР у гэтай галіне абапіралася на дарэвалюцыйны вопыт у Расіі і разглядала развіццё саматужных промыслаў і хатніх рамёстваў у рэчышчы вытворчасці, а іх мастацкую частку – як важны камерцыйны складнік і галіну экспарту. У 1920-я гг. курыравала гэты кірунак секцыя хатніх рамёстваў Інбелкульта, а ў 1930-я гг. дзейнасць арцеляў перайшла ў

сферу кааперацыі і ператварылася ў вытворчасць тавараў народнага спажывання.

З афармленнем аўтарытарнай мадэлі Савецкай дзяржавы ленінскі лозунг «мастацтва належыць народу» ідэалагічна пераакцэнтаваў першапачатковае разуменне народа ў XIX ст. як сялянскай супольнасці на ўвесь клас працоўных. Паняцце «народнае мастацтва», якое раней было тоесным «сялянскаму мастацтву», страціла ў савецкі час свае сацыяльныя межы і сталася шырокім і неакрэсленым. Кніга «Сялянскае мастацтва» Васіля Воранава, аднаго з расійскіх тэарэтыкаў народнага мастацтва, якая ўбачыла свет у 1924 г. [1], і выстаўка 1927 г. у Маскве таксама пад назвай «Сялянскае мастацтва» напярэдадні абвяшчэння ў СССР палітыкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, па сутнасці, азнаменавалі завяршэнне перыяду грамадскай увагі да аўтэнтычнага народнага мастацтва, калыскай якога была вёска.

У перыяд сталінізму і пабудовы «вялікага стылю» ў горадабудаўніцтве, архітэктуры, выяўленчым і іншых відах мастацтва патэнцыял народных творцаў быў пастаўлены на службу ўмацаванню ідэалагічных пастулатаў. Гэта адбывалася праз арганізаваныя мастацкія промыслы і кіраванне народнай творчасцю прафесійнымі мастакамі. Жывая форма існавання народнага мастацтва і рамёстваў абслугоўвала ідэалагемы ўзвышэння, праслаўлення ўлады і дзяржавы. У гэты перыяд сацыяльная практыка нарадзіла гэтак званае «афіцыйнае народнае мастацтва». Дастаткова прывесці ў якасці прыкладу «Ліст таварышу І. В. Сталіну» 1936 г., які быў вышываны народнымі майстрыхамі ўручную на шоўку, або ткацкую майстэрню ў Гродна, у якой вясковыя жанчыны, узятыя ў горад «ад родных ніў, ад роднай хаты», пад кіраўніцтвам прафесійнага мастака Фелікса Шунейкі ткалі вялізныя дываны з партрэтамі правадыроў і на тэмы праслаўлення дасягненняў савецкай улады. Потым функцыя кантролю перайшла да арганізаваных народных промыслаў (фабрык мастацкіх вырабаў), на якіх пры ўдзеле прафесійных мастакоў ствараліся «творы народнага мастацтва» і сувеніры ў беларускім стылі. З надыходам новай эканамічнай рэальнасці ў канцы XX ст. фабрыкі былі расфарміраваныя, і разам з гэтым фактычна перастала існаваць гэтая галіна народнага мастацтва.

Такім чынам, навуковая катэгорыя «народнае мастацтва», якая азначае мастацтва ананімнае, калектыўнае, першаснае, народжаная ў сярэдзіне XIX ст. маладой навукай этнаграфіяй, на працягу XX ст. была ўзята на ўзбраенне мастацтвазнаўствам, сканцэнтраваным на эстэтычным баку гэтага віду творчасці, і вылучыла яго ў

асобны стыль мастацтва – народны, які замацаваў мастацкія структуры і першаформы, народжаныя раннімі грамадскімі структурамі. Прадметна-функцыянальная структура народнага мастацтва, створаная патрэбамі патрыярхальнага ладу жыцця, міфалагічным светапоглядам і рытуальна-абрадавымі практыкамі селяніна, была дэкантэкстуалізаваная, гэта значыць прыстасаваная спачатку да нацыянальнай ідэі, а потым да аўтарытарнай савецкай ідэалогіі, і ўтылітарна пераарыентавана на вонкавага спажыўца – гараджаніна, інтэлігента, а пазней – турыста.

З канца 90-х гг. мінулага стагоддзя і да нашага часу адбылося пераструктураванне грамадскіх форм існавання галіны народнага мастацтва: дзейнічаюць дамы рамёстваў, Саюз майстроў народнай творчасці, спецыяльная камісія Міністэрства культуры надае выбраным аўтарам і рамеснікам статус «народны майстар Рэспублікі Беларусь», які, акрамя пасведчання, не мае ніякага рэальнага падмацавання. Практыка адраджэння народных рамёстваў і аховы нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у незалежнай Беларусі працягвае карыстацца ўстойлівымі паняццямі і тэрмінамі. Інерцыя савецкага часу ў разуменні зместу паняцця «народнае мастацтва» працягвае рухаць сучаснае беларускае мастацтвазнаўства.

Разам з тым змены ў сацыяльнай структуры грамадства, механізму перадачы культурных традыцый, развіццё інфармацыйных тэхналогій і спосабаў камунікацыі вычарпалі канцэптуальны змест, змянілі форму існавання і суб'ектнасць віду творчасці, якую паранейшаму прынята абазначаць як «народнае мастацтва».

У апошні час з'явіліся першыя спробы крытычнага аналізу і пераасэнсавання тэорыі і практыкі народнага мастацтва. Наватарскі крок у гэтым быў зроблены прадстаўніцай польскай гуманітарыстыкі Евай Клекот, якая ў сваёй манаграфіі «Клопаты з народным мастацтвам: густы, ідэалогія, сучаснасць» (2021) [2] абапіраецца на пастулаты тэорыі посткаланіялізму і сцвярджае, што «гісторыя паняцця "народная культура" – гэта ў першую чаргу гісторыя тых, хто назіраў і называў» і што «народнае мастацтва – з'ява, створаная ў рамках інтэлектуальнага дыскурсу» [2, с. 90, 94]. Аналіз польскага вопыту ў галіне народнага мастацтва і промыслаў, заснаваны на еўрапейскім і расійскім досведзе XIX ст., нацыянальнага мадэрнізму пачатку XX ст. і міжваеннага часу, які, як і пээнэраўскі перыяд, шмат у чым быў для нашых народаў агульным, дае ключ для пераасэнсавання тых навуковых традыцый, якія склаліся ў гэтай сферы грамадскай думкі, навукі і практыкі.

Наспела пераацэнка ранейшых пастулатаў і догмаў, сутнасная інвентарызацыя тэрміналогіі, якая павінна наблізіць тэорыю да сацыяльнай практыкі. У прадстаўленым артыкуле можна толькі акрэсліць праблему, паставіць пытанні. Патрэбныя аналіз беларускай рэальнасці ў гэтым відзе мастацкай творчасці на падставе сучаснай метадалогіі, найперш посткаланіяльнай тэорыі і падыходаў сацыяльнай антрапалогіі; абгрунтаванне айчыннай класіфікацыі гістарычных форм народнага мастацтва і адпаведнай тэрміналогіі ў гэтай галіне мастацтвазнаўства.

1. *Воронов, В. С.* Крестьянское искусство / В. С. Воронов // О крестьянском искусстве : избр. тр. / В. С. Воронов. – М., 1972. – С. 10–128.

2. *Klekot, E.* Kłopoty ze sztuką ludową / E. Klekot. – Warszawa : Wydawnictwo Słowo / obraz terytoria, 2021. – 473 p.